**Дук Д.У. (Наваполацк)**

## АРХЕАЛАГІЧНЫ НАГЛЯД ЗА ПРАВЯДЗЕННЕМ БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ У Г. ПОЛАЦКУ Ў 2007 Г. АРХЕАЛАГІЧНЫ НАГЛЯД ЗА ПРАКЛАДАННЕМ ЦЕПЛАТРАСЫ ПА ВУЛ. ГОГАЛЯ

Траншэя цеплатрасы (заказчык – РУП "Віцебскэнэрга") шырынёй 2 м, глыбінёй 1,8–3 м размешчана ў гістарычнай частцы г. Полацка (ахоўная зона Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, гісторыка-культурная каштоўнасць – Вялікі пасад). Археалагічнае назіранне за пракладаннем траншэі праводзілася на ўчастку даўжынёй 182,5 м. Траншэя пракладалася пры дапамозе экскаватара па трасе, якая раней не была пашкоджана будаўнічай дзейнасцю. Нагляд ажыццяўляў Д.У. Дук на падставе Дазволу, выдадзенага Інстытутам гісторыі НАН Беларусі № 1757 па форме № 4.

Траншэя цеплатрасы размешчана паралельна вул. Гогаля ад вул. Камуністычнай да праспекта Ф. Скарыны.

На асноўнай частцы траншэі культурны пласт адсутнічаў. Культурны пласт зафіксаваны на двух участках траншэі, адзін з іх мае даўжыню 16,5 м, размешчаны за 7 м ад паўднёвага канца траншэі (месца злучэння новай і існуючай цеплатрасы на праспекце К. Маркса).

Тут культурны пласт мае магутнасць ад 1,6 да 2 м, у сярэднім – 1,8 м. Пласт моцна папсаваны перакопамі XX ст.

Другі адрэзак размешчаны ў паўночнай частцы траншэі, там, дзе яна пачала пракладвацца ад вул. Гогаля па напрамку да дома № 5 (практычна адпавядае лініі ўсход-захад). Тут на ўчастку траншэі працяглацю 9 м зафіксаваны развал дома. Час існавання дома вызначаецца па наступных прыкметах: фармату цэглы, знаходкам кафлі, зробленай у стылі мадэрн рубяжа XIX–XX ст., шкляным бутэлькам другой паловы XIX – пач. XX ст. Гэты дом быў размешчаны паасобку, паколькі больш ніякіх слядоў іншых збудаванняў побач не выяўлена.

Атрыманыя падчас назірання вынікі далі каштоўны матэрыял для інтэрпрытацыі гістарычнай тапаграфіі Полацка. Так, даследуемая тэрыторыя знаходзіцца па-за межамі гістарычнай забудовы Вялікага пасада (усходняя мяжа пасада па гістарычных крыніцах вызначана па трасе вул. Свярдлова). Адсутнасць культурнага пласта на ўчастку траншэі ад вул. Камуністычнай практычна да праспекта К. Маркса з'яўляецца таму сведчаннем. Гэта тэрыторыя не была заселена да сярэдзіны (канца?) XIX ст. Невялікі культурны пласт з адзінкавымі больш раннімі матэрыяламі выяўлены непасрэдна па трасе праспекта К. Маркса. Гэта дазваляе вызначыць, што бліжэй да Дзвіны, а дакладней да схілу пагорка надпоймавай тэрасы, у познім сярэднявеччы (XIII (?)–XV стст.) існавала пэўная забудова. Яна не з'яўлялася ўласна пасадскай, паколькі характэрных прыкмет культурнага пласта (наяўнасць вялікага стратыграфічна стракатага пласта з рэшткамі арганікі, слядоў драўлянай ці цаглянай забудовы) не выяўлена. Існаванне забудовы па-за межамі Вялікага пасада добра ілюструюць пісьмовыя крыніцы XVI–XVII стст.: менавіта па-за межамі крэпаснай сцяны пасада знаходзіліся гумны, цагельні і іншыя вытворчыя збудаванні палачан.

### Археалагічны нагляд за рамонтам цеплатрасы па вул. Камуністычнай, 15 у г. Полацку

У маі–ліпені 2007 г. ад дома № 15 па вул. Камуністычнай у г. Полацку была распачата рэканструкцыя цеплатрасы. Заказчык: "Філіял Полацкая ТЭЦ". Будаўніча-земляныя работы былі ўзгоднены з Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам (далей – НПГКМЗ). Пачатковая прарэзка некранутага культурага пласта не планавалася, таму першапачаткова археалагічны нагляд праводзіўся навуковым супрацоўнікам НПГКМЗ А.А. Салаўёвым на аснове Дазволу № 1790, выдадзенага Інстытутам гісторыі НАН Беларусі па форме № 3.

Але частка цеплатрасы каля дома па вул. Скарыны, 12 была перанесена і пракладзена па некранутаму пласту. Работы былі спынены на стадыі ўсталявання латкоў пад трубы. Далей археалагічны нагляд праводзіўся Д.У. Дукам на падставе Дазволу, выдадзенага Інстытутам гісторыі НАН Беларусі № 1757 па форме № 4. У работах на ўсіх этапах прымаў удзел А.А. Салаўёў.

Помнік, на якім пракладалася траншэя, уваходзіць у ахоўную зону НПГКМЗ. Гэта тэрыторыя з'яўлялася часткай пасадскай тэрыторыі Полацка з XVIII ст. Даўжыня часткі траншэі па некранутаму пласту складала 27 м. Глыбіня траншэі каля 2,4 м, шырыня дасягала ад 3 да 4,5 м.

Археалагічныя раскопкі ў дадзенай частцы Вялікага пасада не праводзіліся; у 1999, 2000 і 2002 гг. С.В. Тарасавым, Д.У. Дукам і А.А. Салаўёвым быў праведзены археалагічны нагляд за пракладаннем траншэй газа- і водаправодаў [1, с. 241].

Культурны пласт траншэі мае магутнасць у сярэднім 2,2 м, пласт неаднародны і ўключае шмат прапластак вуглёў, пяску, гліны, суглінку. Ён выдатна захоўвае скуру, дрэва, косць і часам мае спецыфічны пах. Зямля вельмі вільготная, камкаватая па структуры, месцамі захоўвае прапласткі драўляных трэсак. Мяжа паміж мацерыком – суглінкам светла-шэрага колеру і культурным пластом – няпэўная. Пласт папсаваны перакопамі, звязанымі з будаўнічай дзейнасцю XX ст.

Магутнасць культурнага пласта на тэрыторыі даследавання дасягае 2,2 м. Большую частку пласта складаюць перакопы, утвораныя ў выніку будаўнічай дзейнасці ў канцы XIX і другой палове XX ст. Ніжэй перакапанага баластнага пласта залягаюць напластаванні XVIII – пачатку XIX ст., якія ўтрымліваюць драўляныя канструкцыі. Вылучаны два будаўнічыя гарызонты. Да позняга адносяцца рэшткі пабудовы на палях, разам з плотам (?), а таксама рэшткі зруба і фрагменты драўляных канструкцый. Пабудова, ад якой захаваліся рэшткі, была зроблена, верагодна, з брусоў 30 х 30 см. Больш ранімі пабудовамі з'яўляюцца рэшткі зрубаў канца XVIII ст. Захавалася частка насціла, які мог быць часткай дваравой тэрыторыі альбо вуліцы.

Назіранні за стратыграфіяй культурнага пласта пацвердзілі меркаванне аб існаванні ў дадзенай частцы Полацка гарбарных майстэрань у XVII – пачатку XIX ст. [1]. Дадзеная частка ў XVIII ст. размяшчалася на перыферыі Вялікага пасада, г. зн. за мяжой былых крэпасных



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

умацаванняў XVII ст. Менавіта ў гэтай частцы горада была сканцэнтравана асноўная колькасць гарбарных майстэрняў разам з жылымі і вытворчымі комплексамі.

Падчас даследавання культурнага пласта была сабрана прадстаўнічая калекцыя археалагічных знаходак, пераважная большасць з якіх датуецца ў межах XVIII–XIX стст.

Керамічны посуд прадстаўлены пераважна венцамі кухонных гаршкоў XVIII–XIX стст. Разам з рэшткамі гаршкоў знойдзены кавалкі місак с плямістай каляровай палівай канца XVIII–XIX ст.

Большасць кафлі прадстаўлена "гладкімі" пласцінамі канца XVIII – сярэдзінай XIX стст. Больш позьнія пласціны зроблены фабрычным спосабам. Вырабы XVII ст. прадстаўлены абломкамі вуглавой рамачнай кафлі з выявай вазы з кветкамі, больш позьнія – бязрамачнымі вырабамі са складанапрафіляванай тарчай. Такія пласціны пакрытыя зялёнай эмаллю. Знойдзена і прафіляваная карнізная кафля, характэрная для другой паловы XVIII ст., гэтым жа часам можна датаваць і фрагмент керамічнай статуэткі жанчыны з коцыкам.

Сярод іншых керамічных вырабаў адзначым знаходкі люлек і свістулек XVII–XVIII стст. Сярод імпартаванай керамікі вельмі цікавым з'яўляецца кавалак куфля з раслінным арнаментам, аздоблены блакітнай палівай.

Большасць шкляных вырабаў прадстаўлена бутэлькамі, квартамі і кавалкамі аконнага шкла, гэтыя вырабы датуюцца канцом XVIII–XIX ст.

Культурны пласт добра захоўвае арганіку, дзякуючы чаму было сабрана шмат фрагментаў металічных, драўляных і скураных вырабаў. Знойдзены цэлыя камплекты дэталяў ботаў, характэрных для XVII–XVIII стст. Таксама знойдзены кавалак дзягі разам з кафляй са складанапрафіляванай тарчай другой паловы XVIII ст.

У культурным пласце на месцы траншэі багата сабрана іншых скураных і драўляных вырабаў, сярод іх: дэталі вёдзер, металічная ручка ад рамеснага інструмента. Унікальнай знаходкай з'яўляецца драўляная люлька з жалезнай аправай унутры гнязда для чубука і чашачкі. Па форме гэтая люлька аналагічная формам керамічных люлек другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. Металічныя вырабы прадстаўлены бронзавай крапёнай накладкай з колцам, абломкам нажніц, скобеля, ключом. Сярод знаходак шмат каваных цвікоў.

**Археалагічны нагляд за рамонтам цеплатрасы па вул. Камуністычнай, 15 у г. Полацку**

У ліпені–лістападзе 2007 г. па завулку вул. Юбілейнай у г. Полацку была пракладзена траншэя цеплатрасы. Заказчык: ДУ "Барысаўскае эксплуатацыйнае ўпраўленне Узброеных сіл". Археалагічны нагляд праводзіўся Д.У. Дукам.

Помнік, на якім пракладалася траншэя, уваходзіць у ахоўную зону Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Гэта тэрыторыя з'яўлялася часткай старажытнага Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра XII–XIX стст. Найбольш значныя археалагічныя даследаванні на помніку праводзіліся ў 1991 г. А.А. Трусавым (раскопкі рэштак Вялікага сабора) [4], у 1987 г. С.В. Тарасавым (археалагічная разведка) [3, с. 30] і ў 2003 г. Д.У Дукам (нагляд за пракладаннем траншэі цеплатрасы) [2]. У выніку праведзеных у 2003 г. даследаванняў была вывучана стратыграфія культурных напластаванняў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра. Выяўлены рэшткі Барысаглебскай царквы XII ст. Гэта прывяло да змены праекта пракладання цеплатрасы ў абыход царквы (зроблены вынас цеплатрасы на ўчастку над храмам).

Сумарная даўжыня траншэі 2007 г. складае больш за 300 м. Шырыня траншэі каля 1,5 м, глыбіня ў сярэднім 1,5 м.

Траншэя 2007 г. пракладалася паралельна траншэі 2003 г. пачынаючы ад цеплапункта (крайняя паўднёвая кропка) да дома па вул. Юбілейнай, 17. Паводле прадстаўленага Заказчыкам праекта ў раёне дома № 17 траншэя перасякала Барысаглебскую царкву. Па гэтай прычыне праект цеплатрасы быў зменены. У кастрычніку былі спраектаваны і здзейснены вынас труб на паверхню на ўчастку каля дома № 17.

Далей траншэя перасякала Юбілейны завулак і пракладалася ўздоўж яго і ў абыход дома № 9 па вул. Юбілейнай. Такім чынам, у 2003 г. траншэя пракладалася па ўсходняму дворыку дома № 9, у 2007 г. – па заходняму. Гэта дало магчымасць вывучыць стратыграфію культурнага пласта былога Бельчыцкага манастыра на 25 м на ўсход ад тэрыторыі археалагічных даследаванняў 2003 г.

У выніку праведзенага археалагічнага нагляду ўпершыню вызначаны характар культурных напластаванняў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра на тэрыторыі, прылягаючай з усходняга боку да дома № 9 па вул. Юбілейнай і ўласна вул. Юбілейнай (паўночна-заходні вугал дома № 9). Знойдзеныя артэфакты дазваляюць меркаваць, што на гэтай тэрыторыі ў XVII–XVIII стст. сяліліся прадстаўнікі вышэйшага уніяцкага духавенства. У іх дамах знаходзіліся печы, зробленыя з геральдычнай кафлі з асабістымі гербамі, кафлі з выявай манаграмы ордэна езуітаў і паліхромнай кафлі з раслінным і геаметрычным арнаментам. Сляды адной пабудовы зафіксаваны ў выглядзе развалу цаглянага падмурку XVIII ст. Гэтая тэрыторыя была заселена і ў XIX ст., аб чым сведчаць знаходкі адпаведнай кафлі. Культурных напластаванняў ранейшых за XVIII ст. не выяўлена, хаця фрагменты плінфы XII ст. з рошчынай былі знойдзены на ўсёй даўжыні траншэі.

Літаратура

1. Дук Д. Кожевенно-сапожное ремесло Полоцка XVI–XVIII вв. (по итогам археологического надзора на территории Великого посада в 2000–2002 гг.) / Д. Дук, А. Соловьёв // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2004. № 19. С. 241–250.

2. Дук Д.У. Справаздача аб археалагічным назіранні за пракладкай траншэі цеплатрасы на тэрыторыі былога Барысаглебскага манастыра г. Полацка ў 2003 годзе / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНБ. Воп. 1. Спр. 2078.

3. Тарасаў С.В. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларуская навука, 1998. 183 с., іл.

4. Трусаў А.А. Археалагічная справаздача аб раскопках Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра XII ст. у Полацку ў ліпені 1990 г. Кн. 1 / А.А. Трусаў // Архіў ІГ НАНБ. Воп. 1. Спр. 1251 а, б.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова